образовательном пространстве : тезисы докладов V международной научно-практической конференции, Гродно, 17 - 18 мая 2012 г. В 2 ч. Ч. 2 / Учреждение образования "Гродненский государственный университет имени Янки Купалы" ; ред. кол.: [и др.], В. Н. Ватыль. – Гродно : ГрГУ, 2012. – С. 16–19.
6. О некоторых мерах по реализации Кодекса Республики Беларусь о культуре [Электронный ресурс] : Постановление Совета Министров Респ. Беларусь, 13 янв. 2017 г., № 25 // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2021.
7. Об утверждении Положения о порядке осуществления общественными объединениями общественного контроля за исполнением законодательства Республики Беларусь об охране историко-культурного наследия [Электронный ресурс] : Постановление Совета Министров Респ. Беларусь, 22 окт. 2008 г., №1570 // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2021.

**Дубатоўка М. А.**

## КАШТОЎНАСЦІ МІНСКАГА АРХІЕРЭЙСКАГА ДОМА Ў 1812 ГОДЗЕ

***Ключавыя словы:*** гісторыка-культурная спадчына, гісторыка-культурная каштоўнасць, мінскі архіерэйскі дом, 1812 год.

Падчас падзей 1812 года ўся тэрыторыя сучаснай Беларусі была акупавана французскімі войскамі. Горад Мінск не быў выключэннем і зведаў свае страты ад вайны, стаўшы цэнтрам Мінскага дэпартаменту - адміністарцыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, створанай французскімі ўладамі на месцы Мінскай губерніі падчас акупацыі. Ахвярай канфлікту стала і Мінскае архіерэйскіае падвор’е - месца жыхарства праваслаўнага епіскапа, главы Мінскай епархіі. Сакральныя рэчы з царквы на падвор’і, як і начынне непасрэдна дома архіерэя, выкарыстоўваліся ўдзельнікамі канфлікту па сваім уласным жаданні, а судовыя разбіральніцтвы па гэтай справе цягнуліся чвэрць стагоддзя.

Вывучэннем дзейнасці Мінскага дэпартаменту пачалі займацца яшчэ за часамі Расійскай імперыі [2]. Сёння гэтай тэме прысвечаныя работы як некаторых айчынных [1, 7], так і замежных гісторыкаў [14]. Да пытанняў лёсу сакральнай спадчыны ў французска-рускай вайне 1812 года звяртаюцца нешматлікія айчынныя даследчыкі. Сярод такіх можна вылучыць артыкулы Ю. І. Літвіноўскай [5] і Л. М. Лісавай [3, 6]. У гэтых працах аўтары разглядаюць становішча каштоўных храмавых рэчаў у вайне, аднак даюць агульны агляд пытання без падрабязнасцяў вывазу ці знікнення прадметаў храмавага начыння. Падзеі ў Мінскім архіерэйскім доме імі таксама закранаюцца, аднак у рэчышчы агульных тэндэнцый лёсу храмаў у 1812 годзе.

Напярэдадні баявых дзеянняў, у красавіку 1812 г. Мінск і Мінская губернія былі далучаны да 1-й ваеннай акругі ў сферы дзеянняў 1-й Заходняй рускай арміі пад кіраўніцтвам М. Барклая дэ Толі. На поўдзень месцілася 2-я Заходняя руская армія на чале з П. Баграціёнам. Пасля ўступлення Вялікай арміі на тэрыторыю Расійскай імперыі ў канцы чэрвеня рускія войскі пачалі адступаць на ўсход. Баграціён накіраваўся на Мінск, спадзеючыся на злучэнняе з арміяй Барклая дэ Толі. Напалеон таксама накіраваў ваенны кантынгент маршала Л. Даву на Мінск з мэтай заняць горад раней за суперніка. Як след, на пачатку ліпеня гэты губернскі горад быў прывабным для абодвух бакоў. Аднак першымі ўвайшлі ў Мінск французы [13, с. 404-405].

Пасля пераходу французкіх войскаў праз заходнія межы імперыі Свяцейшы Сінод прадпісаў праваслаўным епіскапам дзейнічаць паводле рашэнняў грамадзянскіх губернатараў. Адпаведна, гэта значыла эвакуяваць царкоўную маёмасць і выязджаць непасрэдна самім святарам з тэрыторыі акупаваных губерній. Пасаду архіепіскапа Мінскага і Літоўскага ў той час займаў Серафім (Глаголеўскі). 24 чэрвеня Серафім артымаў загад ад Мінскага губернатара П. Добрынскага аб выедзе з горада ў Смаленск. Епіскап паспеў сабраць «церковное серебро архиерейской домовой церкви, лучшие вещи из архиерейской и братской ризницы». Вывезці астатнія сакральныя рэчы не было магчыма з нагоды адсутнасці неабходнага транспарту [8, с. 118-119]. Пасля епіскап пісаў у Сінод аб тым, што па дарозе частка фурманак была згубленая і разрабаваная вайскоўцамі, якія напаткалі абозы [11, арк. 3аб]. Такім чынам, 6 ліпеня расійская адміністрацыя і праваслаўныя святары (за некаторым выключэннем) пакінулі Мінск. Французскія ўлады ўсталявалі ў горадзе сваю адміністрацыю. Губернатарам Мінскага дэпартамента быў прызначаны М. Бранікоўскі, і некаторыя члены гарадавога магістрата перайшлі пад яго кіраўніцтва [13, с. 405].

Лёс Мінскага архіерэйскага дома ў такіх цяжкіх умовах склаўся няпроста. Пасля пераезду архіепіскапа Серафіма ў доме застаўся іераманах Інакенцій, які займаў пасаду эканома, і два іераманахі Антоній і Яўстрацій. Астатні клір з’ехаў у Слуцк [9, арк. 2аб]. Спачатку дом і фальварак былі занятыя “польскім урадам”: так Інакенцій у сваіх данясеннях Мінскай духоўнай кансісторыі называў акупацыйную адміністрацыю, усталяваную ў горадзе. Губернатар Бранікоўскі з іншымі чальцамі ўрада знаходзіліся ў доме каля 5 тыдняў. Па выхадзе іх з дома эканом хацеў праверыць стан рызніцы і пабачыў, «что замки сбиты, печати оторваны, документы, которые с шафою спрятал в землю, вырыты и разбросаны!» [9, арк. 2]. Пасля ў дом паступіла павестка ад створанай акупантамі паліцыі «с предписанием выбыть Иннокентию и монашествующим из дома и о сдаче имения тому, кто от госпо-

дина римско-католических церквей епископа и кавалера Дедерки прислан будет» [9, арк. 2]. Якуб Дадэрка на той момант займаў пасаду мінскага рыма-каталіцкага біскупа. Паводле рашэння гарадской адміністрацыі, Дадэрка пераехаў у былую рэзідэнцыю праваслаўнага архіепіскапа [14, с. 157]. Па прыедзе біскуп забраў у эканома ключы і пачаў ладзіць свае парадкі, таксама склаў свой вопіс рэчаў, якія былі ў доме і якія зніклі, прымусіўшы манахаў падпісаць яго. Апроч таго, ён запрашаў сваіх людзей (тутэйшых памешчыкаў Буйноўскага, Загароўскага і Ляшэвіча), і «они брали что хотели и по своим жилищами уносили» [9, арк. 3].

Такія звесткі маюцца ў данясенні эканома дома Інакенція, які, паводле загада архіепіскапа Серафіма і Мінскай духоўнай кансісторыі, далажыў аб палажэнні спраў у архіерэйскім доме. У студзені 1813 г. распачынаецца справа аб расследаванні падзей у доме падчас французскай акупацыі. Для правядзення следства першапачаткова быў выкліканы протаіерэй Мінскага Петрапаўлаўскага кафедральнага сабора Васіль Салаўевіч і прыватны прыстаў Захарчанка [12, арк. 4].

Паводле рэгістраў, складзеных іераманахам Інакенціем, вынікае, што рэчы з архіерэйскага дома і падвор'я кралі канкрэтныя асобы. Некалькі карэтаў, шматлікі сталовы посуд (фаянсавы, фарфоравы, срэбраны), сурвэткі, падсвечнікі, гадзіннікі, пярсідскія дываны «забирали Минскаго повета помещики Турчинский, бывший при польском губернаторе за секретаря, и здешнего городового магистрата лавник Лисовский, городовой полиции частной пристав Кустрей, римский ксёндз Жилинский, а при забрании экипажа был и шляхтич Кондратович, бывший у польского губернатора конюшим. Всё видел проживавший в то время у Речицкаго повета нижнего земскаго суда заседатель Емелиан Фёдорович Буяновский, да также отчасти видел и здешнего 2-го департамента канцелярист Иван Загоровский» [9, арк. 43]. З фальварка былі скрадзеныя харчовыя запасы (авёс і іншыя крупы), хатняя жывёла і рознае начынне кшталту бочак, саней, броварныя катлы і іншыя рэчы: «магистратские члены Башинский, Ключинский, выше писаный Лисовский, коморник Бобрович прописанные вещи описывали и забирали в своё ведение, а еврей Шлиома Иделиович с повеления их забрал показанные в сем регистре под номером 1 прописанное жито, да при том находился частный пристав Кустрей; означующиеся под номером 6 дрожки взял с воли прописанных магистратских членов» [9, арк. 43аб-44]. Былы камендант пры новым урадзе Міхайлоўскі забраў падушку з архіерэйскай кафедры, сіні аксамітны пояс, шыты золатам і срэбрам, а таксама драўляную палку з-пад крыжа, аздобленую срэбрам і 12 фаянсавых талерак: «показанные вещи

забрал бывший польский комендант Михайловский, который удалился с неприятелем, оставив жену свою, которая ныне находится у помещицы княгини Ганнапольской, и при ней уповательно оставил и прописанные вещи» [9, арк. 44аб].

Каталіцкі святар Якуб Дадэрка пасля заняцця горада расійскімі войскамі і аднаўлення былой адміністрацыі працягвае жыць у архіерэйскім доме. Паводле рэгістра эканома, біскуп таксама прысвоіў сабе як прадукты харчавання, так і начынне дома, рызніцы, прытым у вялікіх памерах [9, арк. 9-15, 93-94].

Канцылярыя Мінскага губернскага праўлення, паводле данясення князя А. Галіцына (які на той момант займаў пасаду галоўнага кіраўніка духоўнымі справамі замежных веравызнанняў), дае загад аб тым, каб вышэй названыя асобы вярнулі маёмасць натураю альбо грашыма, «а что из суммы доставать не будет, взять из их имений в полицейский присмотр». Падчас следства ставілася таксама мэта высветліць, ці рабавалі дом па загадзе былога французскага ўрада або самастойна, па ўласным жаданні [12, арк. 8-10].

У маі 1813 г. праваслаўная кансісторыя піша біскупу Дадэрку, што, па рэгістрах вопісаў, архіерэйскі дом знаходзіцца не ў першапачатковым стане, бо «в церкви две стены каменные, на коих прежде утверждался потолок и иконостас вовсе уничтожены, иконостас поставлен вашим преосвященством на одном только деревянном брусе, утверджённом на двух при стенах поставленных деревянных столбиках, а потому он и ненадёжен»…«в иконостасе нет двух икон с обоих сторон от каменных стен, а места их заставлены теми же досками, на коих прежде были изображены иконы – неискусно, наподобие столбов»…«пол в алтаре составлен почти весь не из целых досок, а из кусков, и то старых и заморанных; в пономарне, где можно было свободно меститься причетникам и другим духовным особам, сделана печь не по пропорции места, так, что она занимает всю почти пономарню…» [9, арк. 238-238аб]. Якуб Дадэрка, як бачна з дакумента, абсталяваў дом на свой густ, а царкву прыстасаваў пад каталіцкі касцёл, перабудаваўшы месца для хора, амвон і іншыя храмавыя элементы па заходняй хрысціянскай традыцыі. І, як след, кансісторыя дасылае яму загад прывесці дом і царкву ў адпаведны стан, пасля чаго пакінуць дом. Аднак біскуп не спяшаўся гэтага рабіць, «только бы Господин Губернатор повелел отвести для него приличный и выгодный дом по предписанию Его Сиятельства» [9, арк. 256аб]. Праваслаўная кансісторыя папрасіла Мінскага грамадзянскага губернатара Добрынскага адшукаць належны дом для біскупа, і ім стаў кляштар бенедыкцінцаў. У рэшце рэшт Дадэрка рапартуе аб тым, што з'ехаў і вярнуў частку

рэчаў у дом, прытым некаторыя з іх былі прынятыя не ў належным стане. Сярод іх былі розных памераў крыжы каштоўных металаў, разнастайная вопратка святароў (некаторая з адарванымі гузікамі), абразы, шафы чырвонага дрэва і іншая мэбля, вазы, талеркі, штофы, званы [9, арк. 225-229]... Спіс уражвае багаццем рэчаў і іх колькасцю. Аднак пасля выезду з архіерэйскага дому Дадэрка напісаў у кансісторыю з патрабаваннем выплаціць яму 40 рублёў за «приделанные им в покоях Вашего преосвященства с фронту двойные окна числом девяти»; грошы яму выплацілі [9, арк. 271].

Тым не менш, ужо ў жніўні 1813 г. протаіерэй Салаўевіч рапартуе аб тым, што справа вядзецца марудна [12, арк. 11]. Не ўся страчаная маёмасць была вярнутая назад, і аб гэтым перыядычна піша праваслаўная кансісторыя ў Свяцейшы Сінод з патрабаваннем следства з боку губернскага праўлення. У красавіку 1814 года Васіль Салаўевіч захварэў, і замест яго для вядзення справы быў назначаны святар Мінскай Кацярынінскай царквы Дзмітрый Заранкевіч [12, арк. 18-19]. Тым жа месяцам А. Галіцын піша ў Санкт-Пецярбург з чарговым данясеннем аб тым, што біскуп Дадэрка вярнуў не ўсе рэчы і не перабудаваў царкву назад пад праваслаўную, і патрабуе ад яго або рэчы вярнуць, або выплаціць 674 рублі 80 капеек срэбрам [9, арк 473].

Некаторыя поспехі ў следства ўсё ж такі былі. У чальца гарадавога магістрата Антонія Лісоўскага, які браў удзел у рабаванні архіерэйскага дому, быў адшуканы адзін анцімінс (аднак без упрыгажэнняў); эканому Інакенцію даюць заданне паехаць у маёнтак Кухцічы, які належаў падтрымаўшаму акупацыйны ўрад памешчыку Турчынскаму, для пошуку там маёмасці архіерэйскага дома і аранжарэйных раслін, якія таксама былі з дома скрадзеныя [9, арк. 513].

У 1816 г. Якуб Дадэрка з’язджае ў Луцк, і А. Галіцын піша Луцкаму каталіцкаму епіскапу Каспару Цецішоўскаму з патрабаваннем выплаты Дадэркам неабходнай сумы. Сума будзе выплачана біскупам у 1818 годзе [9, арк. 533, 609].

У 1820 г. архіепіскап Мінскі і Літоўскі Анатоль скардзіцца ў духоўную кансісторыю, што «дело о разграблении дому архиерейского около двух лет остаётся без всякого действия», і на працягу наступных гадоў справа амаль не вядзецца. Толькі ў 1828 г. (праз 16 год ад ваенных падзей), пасля таго, як справа шмат разоў перадавалася то ў Мінскую паліцыю, то ў 1-ы дэпартамент Галоўнага суда, то ў Мінскі павятовы суд, Мінскае губернскае праўленне напісала далажэнне ў кансісторыю аб наступным. Было прынята меркаваць, сыходзячы з матэрыялаў следства, што тыя асобы, якія кралі маёмасць архіерэйскага дома, рабілі гэта па загадзе губернатара М. Бранікоўскага і

французаў. Памешчык Лісоўскі і ксёндз Жылінскі былі вызваленыя ад адказнасці за нядоказам злачынства. З астатніх асобаў неабходна спагнаць сумы, эквівалентныя нанесеным стратам [9, арк. 767-769, 775]. Тагачасны эканом архіерэйскага дома Логін спрабаваў абскардзіць рашэнне, упэўнена кажучы, што няма аніякіх доказаў таго, што кралі менавіта па загадзе французаў, бо «всем известно, что французы в управлении гордом и губерней не участвовали», а «правительство состояло из одних поляков и действовало независимо от французов»; маёмасць рабавалі «в свою пользу и делились со своими приятелями» [9, арк. 802-809аб]. Аднак звестак аб тым, ці была разгледжаная скарга эканома, не прадстаўлена.

Завяршаецца справа лістом 3-га аддзялення ў Свяцейшы Сінод ад 21.04.1837 г. Згодна з ім, пачынаючы ад данясення эканома Інакенція, нельга дакладна высветліць, хто і што браў з архіерэйскага дома і ў якіх колькасцях. Асноўная адказнасць палягае на тых, «кои ясными уликами и обстоятельствами изоблачены в незаконном присвоении собственности архиерейского дома» [9, арк. 830-831], гэта былы губернатар Бранікоўскі і Міхайлоўскі, якія збеглі за мяжу. Таксама адказнасць падае на прадстаўнікоў судовых органаў, якія зацягвалі вядзенне справы. Астатнія фігуранты справы, якія «всемилостливейшим манифестом 12 декабря 1812 и 30 августа 1814 годов коими преданы вечному забвению и глубокому молчанию», не могуць быць абвінавачаны ў рабаванні маёмасці дома [9, арк. 831].

Такім чынам, скрадзеныя падчас падзей 1812 года рэчы з архіерэйскага дома, царквы і фальварка былі вярнутыя толькі часткова; большасць начыння знікла. Адміністрацыйныя органы ўлады не былі дужа зацікаўленыя падрабязным разбіральніцтвам гэтай справы, што, магчыма, і спарадзіла такі сумны вынік следства. Тым не менш, сакральнае начынне архіерэйскага падвор'я яшчэ ў перыяд ваенных падзей 1812 года і пасляваенны час лічылася каштоўным і значным, аб чым сведчаць шматлікія спробы праваслаўных святароў дамагчыся справядлівага разбіральніцтва на працягу столькіх год. Лёс абразоў, адзення святароў, вытанчанай мэблі, мастацкага сталовага посуду архіерэйскага падвор'я з сённяшніх пазіцый выглядаюць як значныя гісторыка-культурныя каштоўнасці. Адпаведна, гісторыя іх разрабавання ў 1812 г., матывацыя ўдзельнікаў гэтага працэсу, перамяшчэнне акрэсленых прадметаў, спробы іх вяртання ў пасляваенныя дзесяцігоддзі выступаюць як важныя, вартыя пільнай ўвагі кірункі даследавання.

1. Вилейко, С. Л. Обстановка в белорусских губерниях в период войны 1812 г. / С. Л. Вилейко // Войны XIV–XX вв. в судьбах белорусского народа : сборник научных статей Международной научно–практической конференции, Минск, 4 декабря 2014 г. / Бел. нац техн. ун–т ; Воен. акад. МО РБ ; редкол.: В. А. Божанов [и др.]. – Минск : БГАТУ, 2015. – С. 94–103.
2. Краснянский, В. Г. Минский департамент Великого княжества Литовского / В. Г. Краснянский. – СПб, 1902. – 68 с.
3. Лисова, Л. Об ущербе, нанесенном памятникам архитектуры Менска и Менской губернии во время войны 1812 г. (по документам Национального исторического архива Беларуси) / Л. Лисова // Каштоўнасці мінуўшчыны: праблемы збераджэння гісторыка– культурнай спадчыны Мінска : матэрыялы канф., Мінск, 12 лістап. 1997 г . / пад агул. рэд. С. В. Марцэлева. – Мінск, 1998. – С. 117–125.
4. Литвиновская, Ю. И. Тенденции в настроениях дворянства Беларуси накануне войны 1812 г. / Ю. И. Литвиновская // Працы гістарычнага факультэта БДУ : навук. зб. Вып. 6 / рэдкал.: У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУ, 2011. – С. 59–66.
5. Литвиновская, Ю. И. Восстановление позиций Православной церкви в Беларуси после войны 1812 г. / Ю. И. Литвиновская // Працы гістарычнага факультэта БДУ : навук. зб. Вып. 5 / рэдкал.: У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУ, 2010. – С. 81–91.
6. Лісава, Л. М. Становішча цэркваў пасля вайны 1812 г. / Л. М. Лісава // Памяць: Гіст.–дакум. хроніка Мінска. У 4 кн. Кн. 1-я. – Мн. : БЕЛТА, 2001. – С. 409–410.
7. Лютых, С. А. Минск во время войны 1812 г. / С. А. Лютых // Сборник работ 65–ой научной конференции студентов и аспирантов Белорусского государственного университета. В 3 ч. Ч. 1. – БГУ, 2008. – С. 95–98.
8. Мельникова, Л. В. Русская православная церковь в Отечественной войне 1812 года / Л. В. Мельникова ; Рос. акад. наук, Ин–т рос. истории. – Москва : Изд. Сретенского монастыря, 2002. – 238 с.
9. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 2857 Дело о расхищении во время неприятельского нашествия разными лицами имущества Минского архиерейского дома.
10. НГАБ. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 2858 Дело о получении и исполнении консисторией, архиерейским домом, духовными правлениями и монастырями указа Синода о представлении сведений о понесённых убытках во время отечественной войны 1812 года.
11. НГАБ. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 2855 Дело об оказании Синодом материальной помощи Минскому архиерейскому дому в связи с убытками при эвакуации во время Отечественной войны 1812 года.
12. НГАБ. – Ф. 299. Воп. 2. Спр. 236 Дело о расследовании хищений из Минского архиерейского дома во время нашествия Наполеона 1 на Россию в 1812 году.
13. Памяць: Гіст.–дакум. хроніка Мінска. У 4 кн. Кн. 1-я. – Мн. : БЕЛТА, 2001. – 576 с.
14. Постникова, А. А. Минск в 1812 году: между Россией и Францией / А. А. Постникова // Запад, Восток и Россия: Вопросы всеобщей истории. – 2017. – Вып. 19 : Исторический опыт межкультурного диалога. – С. 148–162.